# З Новым годам!


# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Газета Беларускага дзяржаўнага універсітэта

19 снежня 2002 года, чацвер, № 17 (1865)


*Паважаныя супрацоўнікі і студэнты Белдзяржуніверсітэта!*

*Ад усёй душы віншуем вас і вашых родных з Калядамі і Новым годам!*

*У гэтыя святочныя дні з радасцю сустракаеш сваю будучыню і з удзячнасцю ўспамінаеш урокі і выпрабаванні, якія прынёс мінулы год і якія пайшлі толькі на карысць! Самае галоўнае для чалавека — быць у няспынным пошуку сваёй лепшай сутнасці.*

*Мы хочам, каб Новы год прынёс у вашыя дамы душэўны спакой, радасць, надзею і веру ў лепшую будучыню. А яны, у сваю чаргу, дапамогуць у вашай творчасці і павялічаць вашу прагу да навукі.*

*Шчасця, моцнага здароўя, дабрабыту і поспехаў у здзяйсненні ўсіх вашых планаў і пажаданняў!*



Фота IREX/PROMEDIA

**СВЯТЫ**

## У Новы год з добрым настроем

Новы Год — улюбёнае свята многіх народаў свету. Па першым дні года стараліся ўгадаць, якімі будуць наступныя дні і месяцы, гадалі пра ўраджай і свой лёс у наступаючым годзе.

Вядомае ўсім выказванне "як пачнеш, так і далей пойдзе" сталася асновай для некаторых прыкметаў, правілаў паводзінаў, якія датычаць Новага года. Калі нешта здарылася з чалавекам на Новы год, дык і цэлы год будзе з ім адбывацца такое. Калі першы дзень у годзе шчаслівы, дык і ўвесь год будзе такім. А яшчэ адна прыкмета сцвярджае: калі хтосьці на Новы год чхне — гэта да дабрабыту.

Важную ролю пры сустрэчы Новага года адыгрывае адзенне. Лічыцца, што ў першы дзень новага года трэба апранацца ва ўсё новае і на працягу дня некалькі разоў пераапранууцца — каб заўжды былі абноўкі.

Трэба зазначыць, што багацце навагодняга стала таксама мае вялікае значэнне. Кожная гаспадыня імкнецца зрабіць яго багатым, а сытая разнастайная ежа нібыта змушае і астатнія дні на багаты стол.

Каб забяспечыць дабрабыт наступаючага года, яму трэба наладзіць вясёлую сустрэчу. Гарадскія ўлады кожны год рыхтуюць разнастайную праграму сустрэчы Новага года. І ўжо зараз у некаторых раёнах горада стаяць упрыгожаныя навагоднія ёлкі, а святочны настрой адчуваецца ва ўсім.

У хуткім часе асаблівым святлом заззяюць агеньчыкі навагодняй ёлкі, якая з'явілася ва універсітэцкім гарадку. Падрыхтаваў сваю праграму навагодніх святкаванняў і прафкам нашага універсітэта. Усе дзеці універсітэцкіх супрацоўнікаў да 14 гадоў (а такіх дзяцей каля трох тысяч) атрымаюць навагоднія падарункі. Для дзяцей будуць арганізаваныя навагоднія прадстаўленні. Акрамя таго будуць наладжаны дыскатэкі, а кіраўніцтва факультэтаў і падраздзяленняў будзе купляць супрацоўнікам білеты ў тэатры і цырк.

*Вольга НОВІКАВА*

**ГАРАСКОП**

## Пашанцуе Свінням і Пацукам

Паводле ўсходняга календара, наступны год будзе годам Казы (Авечкі). Ён распачнецца 1 лютага 2003 года. Каза — жывёла ціхмяная і спакойная, яе родная стыхія — зямля, яе планета — Сатурн.

Людзі, народжаныя ў год Казы, упартыя і капрызныя, як і гэтая жывёла. Козы — песімісты, у якіх часта мяняецца настрой. Але яны яшчэ і вельмі клапатлівыя, міралюбівыя, схільныя да самаахвярнасці, маюць артыстычныя здольнасці. Найлепшыя прафесіі для Коз — доктар, святар, палітык, сацыяльны работнік, артыст, мастак. Шанцаваць у жыцці такім людзям пачынае ўжо толькі ў дарослым узросце, але старасць Казы будзе забяспечанай.

Што ж нясе астатнім наступны год? Каза 2003 года будзе схіляцца да стыхіі вады, а значыць, усіх нас будуць вабіць таямнічыя сферы жыцця. Павысіцца цікаўнасць да рэлігіі,



прычым не традыцыйных накірункаў. Вялікае значэнне набудзе псіхалогія зносінаў. Камерцыя часова страціць свой навязлівы рэкламны імідж і пачне будавацца на аснове тонкага псіхалагічнага маніпулявання.

Астролагі прадказваюць, што ўдалым гэты год будзе для тых, хто нарадзіўся ў год Свінні альбо Пацука. Няўдачы чакаюць Тыграў і Зайцоў. Зрэшты, Тыграм з Зайцамі не варта засмучацца: ёсць жа і іншыя календары!

Складаным месяцам для ўсіх стане люты, асабліва яго заканчэнне. Варта ўстрымацца на гэты час ад дальніх паездак. Канец сакавіка і красавік — спрыяльны час для ўвасаблення сваіх задум. Можна шмат дамагчыся, шмат паспець. Гэта такса сама спрыяльны час для адпачынку, забаваў і асабістага жыцця. У маі, прадказваюць астролагі, адбудзецца рост сацыяльнага напружання. Зато канец чэрвеня і ліпень — вельмі гарманічны і перспектыўны перыяд. У гэты час можна ўкараняць у жыццё новыя ідэі, пашыраць свой бізнес, рэфармаваць яго. Верасень абяцае стаць, паводле астралагічных прадказанняў, месяцам грамадскага супрацьстаяння, гэта час павышанай рызыкі ў эканамічнай і фінансавай сферы. У гэты ж перыяд павысіцца верагоднасць тэхнагенных і прыродных катастрофаў. Аднак у кастрычніку і лістападзе надыдзе час стабілізацыі.

**НЕ ПРАМІНІЦЕ**

## Студгарадок запрашае

Навагоднія святкаванні адбудуцца ва ўсіх інтэрнатах БДУ. Ужо адсвяткавалі інтэрнаты №№ 6 (12 снежня), 1 і 9 (18 снежня). Бліжэйшымі днямі пройдуць наступныя святкаванні:

19 снежня — інтэрнат № 5;
20 снежня — інтэрнат № 7;
23 снежня — інтэрнат № 5;
24 снежня — інтэрнат № 10;
25 снежня — інтэрнат № 3;
26 снежня — інтэрнат № 4.

Пачатак усіх мерапрыемстваў у 19.00.

Апроч таго, 24 снежня адбудзецца навагодні матч па мініфутболе паміж супрацоўнікамі студгарадка і студэнтамі.

Для дзяцей супрацоўнікаў адбудуцца два святочныя мерапрыемствы. 31 снежня ў 19.00 Дзед Мароз і Снягурка завітаюць у інтэрнат № 8, каб павіншаваць дзяцей, якія жывуць там. А 5 студзеня ў 12.00 у інтэрнаце № 5 адбудзецца навагодні дзіцячы ранішнік.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

19 снежня 2002 года, чацвер, № 17 (1865)

ВІНШУЕМ!

# З крытыкай і журналістыкай па жыцці

*У лістападзе свой 80-гадовы юбілей адзначыла Ефрасіння Ланідаўна Бондарава — вядомы кінакрытык, прафесар кафедры літаратуразнаўча-мастацкай крытыкі факультэта журналістыкі, Заслужаны дзеяч навукі Беларусі. Многія журналісты мелі шчасце быць яе студэнтамі. Напярэдадні дня нараджэння я сустрэлася з Ефрасінняй Леанідаўнай.*



— Крытык пачынаецца з жадання пазнаць... Не, я не рызыкну аспрэчваць словы А.С. Пушкіна, што крытык пачынаецца з любові да слова. Я стала займацца кіно, калі ў студэнцкія гады ўладкавалася на працу ў Міністэрства кінематаграфіі. І так здарылася, што менавіта праз пазнанне кіно, на кінаматэрыяле я авалодвала прафесіяй журналіста.

Як кінарэдактар я імкнулася пісаць дакладна і сцісла. Практычная работа давала фактычны матэрыял — аб цікавых людзях, сюжэтах, паводле якіх ствараліся мастацкія кінакарціны.

Крытыкам я сябе доўга не асмельвалася называць — пакуль уласнымі рукамі не "перабрала" ўвесь працэс стварэння фільма, пакуль не зразумела, па якіх законах ствараюцца героіка-патрыятычныя стужкі, кінакамедыі, як літаратурныя творы альбо п'есы ператвараюцца ў фільмы.

Першыя мае рэцэнзіі, гутаркі з кінамайстрамі будаваліся на знаёмстве і вывучэнні творчасці заснавальнікаў беларускага кіно: Юрыя Тарыча, Уладзіміра Корш-Сабліна, Льва Голуба. І каб увайсці ў створаны імі кінасвет, неабходна было і сцэнарыі чытаць, і на здымках бываць, і пісаць падрабязныя высновы, каб спецыялісты, якія прымаюць у Маскве нашыя карціны, паверылі іх зместу і вобразнаму ладу.

Так я ўсё больш уцягвалася ў кінематограф, глыбей пазнавала яго і захаплялася ім. У канцы 50-х — пачатку 60-х гадоў у савецкі (і беларускі ў тым ліку) кінематограф прыйшлі з Інстытута кінематаграфіі маладыя цікавыя кінарэжысёры, аператары, мастакі. З імі было цікава размаўляць і пісаць пра іх. Так з'явіліся творчыя партрэты, рэцэнзіі (больш глыбокія, чым ранейшыя), агляды, а за імі і кнігі пра творчасць Б. Сцяпанава, І. Дабралюбава і многіх іншых.

Прайшло ўжо шмат часу, я даўно працую на факультэце журналістыкі, распрацавала курсы па крытыцы, кінамастацтве, прынцыпах узаемадзеяння мастацтва і сродкаў масавай інфармацыі. Але ж ад сваіх базавых пазнанняў я не адрываюся. І кінематограф стаў для мяне ўлюбёным заняткам, як і журналістыка, а праз іх — пазнанне людзей, гутаркі з імі і, па магчымасці, аддача таго, што сабрана і чым можна падзяліцца...

*Вольга НОВІКАВА*

ВЫСТАВЫ

# Навагодні талісман



Хутка бяжыць час — не паспелі азірнуцца, як сыходзіць ужо 2002 год. Наперадзе — казка, цудоўнае навагодняе свята. Ёсць сэнс напярэдадні свята завітаць у каменнае царства і бліжэй пазнаёміцца з яго прынцамі і прынцэсамі на XVII Міжнароднай мінералагічнай выставе "Каменная казка". Яна ладзіцца ў актавай зале нашага універсітэта з 18 па 22 снежня. У гэтыя дні сустракаюцца калекцыянеры, майстры ювелірнай справы і госці з Беларусі, Расіі, Украіны і іншых краін. Тут можна набыць упрыгожанні, талісманы, сувеніры з камянёў.



На такіх выставах заўсёды таямніча зіхацяць і грэюць сэрца праменьчыкі бурштыну, зачароўваюць дзівоснай гармоніяй непаўторна прыгожыя каменныя "фіялкі" — аметысты. Тут суседзіць майская зеляніна малахітаў і хрызапразаў з бэзавым туманом чараіту...

Паспрабуйце пачуць напярэдадні новага года таямнічую мелодыю чароўнага свету камянёў, іх крыштальны перазвон. Сустрэньце Новы год не толькі з зіхаткімі свечкамі і пырскамі шампанскага, але і з талісманам.



*Валянціна СМАЛЯКОВА,*
*загадчыца музея землязнаўства геаграфічнага факультэта*



ПАДПІСКА — 2003

# Часопіс для сацыёлагаў

Часопіс "Социология" — першае ў Рэспубліцы Беларусь выданне па пытаннях сацыялогіі. Выдаецца з кастрычніка 1997 года, заснавальнік — БДУ.

На старонках часопіса прадстаўлены тэарэтычныя, метадычныя, інфармацыйныя матэрыялы, звесткі пра вынікі прыкладных сацыялагічных даследаванняў, хроніка асноўных падзей навуковага сацыялагічнага жыцця, звесткі пра дысертацыі, абароненыя ў Беларусі па сацыялогіі. Спецыяльны раздзел прысвячаецца аспіранцкім даследаванням.

У ліку аўтараў часопіса — вядучыя сацыёлагі Беларусі, Расіі, Украіны, іншых краінаў СНД, а таксама ЗША, Германіі, Вялікабрытаніі, Аўстрыі, Польшчы і інш.

Часопіс уключаны ВАК у лік выданняў для публікацыі матэрыялаў пры абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый.

Выданне разлічана на чытачоў, якія спецыялізуюцца ў галіне сацыялогіі, а таксама сумежных галінаў навукі: выкладчыкаў, навуковых супрацоўнікаў, аспірантаў, студэнтаў, спецыялістаў-практыкаў.

Перыядычнасць выхаду часопіса — 1 раз у квартал.

Падпісны індэкс: для індывідуальнай падпіскі — 74932, для ведамаснай падпіскі — 00245.

Падпісная цана на часопіс на першае паўгоддзе 2003 года: для індывідуальных падпісчыкаў — 5106 руб., для прадпрыемстваў і арганізацый — 9096 руб.

Падпісацца на часопіс "Социология" можна ва ўсіх аддзяленнях сувязі Рэспублікі Беларусь (паступленне ў продаж абмежавана).

ФЕСТЫВАЛІ

# Бардаўская песня

У актавай зале філалагічнага факультэта БДУ 11 снежня прайшоў фестываль студэнцкай песні "Срэбраныя струны". Ужо каторы раз студэнты нашага універсітэта спаборнічалі паміж сабой за права называцца лепшым у дзвюх намінацыях — "Аўтар" і "Выканаўца".

Нехта з удзельнікаў конкурсу настройваў слухачоў на задуменны лад, прымушаючы паразважаць пра сэнс жыцця, а хтосьці наадварот задаваў жартаўлівы тон (як, напрыклад, выканаўцы Андрэй Буцень і Андрэй Семеняка з песняй пра мамантаў). Аднак усе ўдзельнікі былі настолькі таленавітымі, што членам журы было вельмі цяжка размеркаваць прызавыя месцы. А ў склад журы ўваходзілі знаўцы і аматары бардаўскай песні: прарэктар па вучэбна-выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях В.В. Сувораў, намеснік прарэктара па выхаваўчай рабоце, дырэктар студэнцкага гарадка БДУ П.М. Бычкоўскі, намеснік дырэктара студэнцкага гарадка БДУ па сацыяльных пытаннях Р.П. Папок, метадыст па інфармацыйна-выхаваўчай рабоце І.А. Хазеева, старшыня клуба аўтарскай песні БДУ Г.К. Тучкоўскі, Аляксей Нежавец і Аляксандр Саскавец.

Пераможцамі ў намінацыі "Аўтар" сталі Арцём Сугакаў (ФМА, інтэрнат № 4) — 1 месца, Ірына Жыбуль (юркаледж, інтэрнат № 9) — 2 месца. Лепшымі выканаўцамі былі названы Андрэй Буцень (фізфак, інтэрнат № 7) і Андрэй Семеняка (ММФ, інтэрнат № 7) — 1 месца, Яўген Локцеў (ФРФіЭ, інтэрнат № 10) — 2 месца. Спецыяльны прыз атрымала Марыя Станоўка (філфак, інтэрнат № 7) — як аўтар лепшай песні.

Гран-пры фестывалю атрымаў студэнт хімфака Ілля Дабрыдзенеў з інтэрната № 3. Як адзначылі члены журы, менавіта яго музыка і тэксты цалкам адпавядаюць канонам бардаўскай песні.

*Юлія ПАЗАР,*
*Кацярына ЛОБАЧ*
*Фота Сяргея КАХАЎЦА*



*Уладальнік Гран-пры фестывалю Ілля ДАБРЫДЗЕНЕЎ*

У ПРАФКАМЕ СУПРАЦОЎНІКАЎ

# Пра нас клапоцяцца

Прафсаюзная арганізацыя супрацоўнікаў БДУ сёння налічвае 6.175 членаў і працуе на поўную моц. Праца ідзе па такіх напрамках, як культурна-масавая работа, жыллёва-бытавая, лекава-аздараўляльная і спартыўна-масавая.

Што да жыллёва-будаўнічай работы, дык у прафкаме вядзецца ўлік членаў, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоваў. У хуткім часе скончыцца будаўніцтва дома на 63 кватэры. Дзякуючы намаганням прафкама частка супрацоўнікаў БДУ, якія ўваходзяць у КІЗ (калектыў індывідуальных забудоўшчыкаў), атрымала крэдыт. Акрамя таго, прафкам бярэ чынны ўдзел у размеркаванні месцаў у маласямейным інтэрнаце на вул. Крапоткіна.

Камісія па культурна-масавай рабоце імкнецца разнастаіць вольны час супрацоўнікаў нашага універсітэта: арганізуе калектыўныя наведванні тэатральных пастановак, канцэртаў, паездкі па гістарычных і запаведных мясцінах Беларусі. Плануецца і паездка ў Расію. Наогул кажучы, планаў шмат, хаця 2002 год і быў "малаграшовым".

Вельмі добра наладжана ў прафсаюзе спартыўна-масавая работа: працуюць секцыі плавання, аэробікі, тэніса, футбола, валейбола, баскетбола, шахматаў. Заняткі праводзяць спецыялісты кафедры фізвыхавання. Штогод адбываецца спартакіяда "Здароўе", падчас якой вызначаюцца лепшыя факультэты і лепшыя спартсмены-актывісты. Удзельнічаюць універсітэцкія спартсмены і ў гарадскіх спартакіядах "Здароўе" і таксама займаюць прызавыя месцы.

У галіне аздараўляльнай работы прафкам нашага універсітэта шчыльна супрацоўнічае з НВА "Гарызонт", якое прадастаўляе дзецям супрацоўнікаў пуцёўкі ў летні аздараўляльны лагер: сёлета там змаглі пабываць больш за 300 дзяцей. Кошт такой пуцёўкі для бацькоў складае 10 % ад поўнага кошту (розніцу — да 200—300 тысячаў рублёў — даплачвае прафкам). Трэці год на базе "Заходняя Бярэзіна", што належыць геаграфічнаму факультэту, у жніўні адпачывае больш за 250 супрацоўнікаў БДУ з сем'ямі.

Прафсаюзны камітэт аказвае матэрыяльную дапамогу тым, хто мае ў гэтым патрэбу: у сувязі са смерцю супрацоўніка (10 мін. заробкаў), у сувязі са смерцю блізкагка сваяка (5 мін. заробкаў), у сувязі з нараджэннем дзіцяці (4 мін. заробкі), пры працяглай хваробе (3 мін. заробкі), пры юбілеях (2 мін. заробкі).

Пры прафкаме існуе камісія па працоўных спрэчках (КПС), якая вырашае канфліктныя сітуацыі паміж членамі прафсаюза і адміністрацыяй.

Як бачым, прафсаюз не толькі абараняе правы працоўных, але і дазваляе ім зрабіць свой вольны час цікавым.

*Вольга НОВІКАВА*

АБ'ЯВЫ

# Рэктарат Беларускага дзяржаўнага універсітэта

*аб'яўляе конкурс на замяшчэнне пасад:*

ЗАГАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: міжнароднага прыватнага і еўрапейскага права, дыпламатычнай і консульскай службы, эканамічнай тэорыі, тэарэтычнай і інстытуцыянальнай эканомікі, менеджменту і арганізацыі аховы здароўя, медыка-сацыяльнай работы і медыцынскай псіхалогіі, біялогіі развіцця і медыцынскай біялогіі;

ПРАФЕСАРАЎ КАФЕДРАЎ: міжнародных эканамічных адносін, дыпламатычнай і консульскай службы, грамадзянскага працэсу і працоўнага права, біялогіі развіцця і медыцынскай біялогіі;

ДАЦЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: методыкі выкладання фізікі і інфарматыкі, інфармацыйнага і праграмна-матэматычнага забеспячэння аўтаматызаваных вытворчасцяў, крыніцазнаўства, гісторыі новага і найноўшага часу, грамадзянскага працэсу і працоўнага права, тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, канстытуцыйнага права, крыміналістыкі, грамадзянскага права, крымінальнага працэсу і пракурорскага нагляду, біялогіі развіцця і медыцынскай біялогіі, фармацыі, грамадскага здароўя і аховы здароўя, менеджменту і арганізацыі аховы здароўя;

СТАРШЫХ ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: агульнай фізікі, методыкі выкладання фізікі і інфарматыкі, сістэмнага аналізу, рускай мовы, этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў, канстытуцыйнага права, грамадзянскага працэсу і працоўнага права, тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, крыміналістыкі, паліталогіі, біялогіі развіцця і медыцынскай біялогіі, медыка-сацыяльнай работы і медыцынскай псіхалогіі, клінічнай медыцыны, грамадскага здароўя і аховы здароўя, раманскіх моў, нямецкай мовы, фізічнага выхавання і спорту;

ВЫКЛАДЧЫКАЎ КАФЕДРАЎ: раманскіх моў, усходніх моў, клінічнай медыцыны, фізічнага выхавання і спорту;

АСІСТЭНТАЎ КАФЕДРАЎ: фізіялогіі чалавека і жывёл, генетыкі, менеджменту.

*Тэрмін конкурсу — адзін месяц з дня апублікавання аб'явы.*

*Адрас: 220050, г. Мінск, вул. Бабруйская, 5-а, БДУ, упраўленне кадраў, тэл. 209-54-36.*

АДКРЫЦЦІ

# Утаймаванне сонца

Месяц таму навукоўцы біялагічнага факультэта паспяхова скончылі апошнія доследы па распрацоўцы новага крэму для загару, склад якога быў атрыманы вельмі нечаканым чынам. Зацятыя аматары загару ведаюць, што ў склад "пляжнай парфумы" часта ўваходзіць меланін, які надзейна абараняе скуру ад шкоднага ўплыву сонца. Аднак не ўсе ведаюць, што гэтае рэчыва ўключае некаторыя хімічныя дабаўкі, якія пасуюць, на жаль, не кожнаму. Цяпер гэтая праблема вырашаная, бо ўдалося атрымаць стопрацэнтна чысты прыродны меланін са звычайных плесневых грыбкоў. Гэтая тэхналогія гарантуе надзейную нейтралізацыю шкодных ультрафіялетавых промняў і роўны загар. Апроч таго, гэта і эканамічна выгадная тэхналогія, што прызналі і заходнія эксперты, якія супрацоўнічаюць з БДУ. Яны нават выказалі намер набыць узор рэчыва для больш дасканалага вывучэння. Завод "Белмедпрэпараты" ўжо распачаў выпуск меланінавай мазі, і нам застаецца хіба што зрабіць яе запасы і чакаць сонечнага лета.

*Дзяніс ТРАФІМЫЧАЎ,*
*студэнт факультэта журналістыкі*

НАВУКОВЫ ІНТАРЭС

# Водарасці пад наглядам

Ці даводзілася вам хоць калі ўлетку купацца ў Камсамольскім возеры? Шчыра кажучы, не раю гэта рабіць. Гэтаксама кажа і старшы навуковы супрацоўнік навукова-даследчай лабараторыі возеразнаўства БДУ Галіна Сяргееўна Гігевіч. Хто-хто, а яна дакладна ведае, дзе ў Беларусі купацца можна, а дзе лепш не рызыкаваць. Ужо некалькі год разам з іншымі навуковымі супрацоўнікамі лабараторыі Галіна Сяргееўна займаецца маніторынгам вышэйшай воднай раслiннасці на тэрыторыі Беларусі. Такая дзейнасць уваходзіць у нацыянальную сістэму маніторынгу навакольнага асяроддзя краіны.

Даследчыкі лабараторыі стварылі цэлую сетку пунктаў назірання за станам раслiннасці ў вадаёмах па ўсёй Беларусі. Сёння пад наглядам знаходзяцца 46 азёраў, 23 ракі і 4 вадасховішчы. Гэта самыя буйныя, самыя глыбокія вадаёмы краіны.

Водарасці служаць своеасаблівым біяіндыкатарам. Таму на падставе назіранняў за імі вызначаецца стан усёй воднай экасістэмы. Гэта адна з асноўных задач маніторынгу.

Сам працэс даследавання воднай раслiннасці вельмі цікавы. Штогод пры канцы вегетатыўнага перыяду група спецыялістаў выязджае на вадаёмы, каб сабраць там водарасці. Потым сабранае багавіннe сушаць і дробняць, яно праходзіць працэс залення: сабраныя водарасці спальваюць да стану прысаку. І толькі пасля таго ў лабараторыі праводзяцца даследаванні атрыманага прысаку на наяўнасць у ім часціц цяжкіх металаў. Калі ўзровень утрымання часціц высокі, трэба біць ва ўсе званы.

Даследчыкі комплексна вывучаюць раслiннасць азёраў, рэк і вадасховішчаў. Яны выяўляюць характар размяшчэння відаў у вадаёме, сярэднюю вышыню раслін па ярусах, багацце кожнага віду ў цэлым і г.д. Паступова складаецца поўнае ўяўленне пра стан воднай экасістэмы. Калі яна забруджана, то лабараторыя возеразнаўства распрацоўвае праект ачышчэння вадаёма і накіроўвае дакументы ў мясцовы райвыканкам. Напрыклад, цяпер па такім праекце ачышчаецца возера Свіцязь і прылеглая да яго тэрыторыя.

Кожны год лабараторыя возеразнаўства БДУ дае справаздачу ў Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, у якой паведамляе пра вынікі маніторынгу. Інфармацыя штогод папаўняецца новымі звесткамі. Так, напрыклад, у 2002 годзе супрацоўнікі лабараторыі даследавалі 8 азёраў і 2 ракі, якія раней ніколі не вывучаліся ў гэтым плане. У іх была выяўлена своеасаблівая флора.

Інфармацыя, пададзеная ў справаздачы, мае вялікае навуковае значэнне. Яна можа служыць падставай для выдачы ліцэнзій на будаўніцтва гідратэхнічных аб'ектаў.

Зараз снежань. Вегетацыйны перыяд даўно скончыўся, вадаёмы пакрыліся лёдам. Аднак супрацоўнікі лабараторыі працягваюць працы па маніторынгу. Здавалася б, які маніторынг у снежні? Але менавіта цяперашні этап працы мае вялікае значэнне і вымагае ад выканаўцаў увагі і цярплівасці. Ідзе апрацоўка сабранай інфармацыі, новыя веды ўключаюцца ў сістэму — пішацца справаздача за 2002 год. А справа гэта нялёгкая, заўважае Галіна Сяргееўна. Бо займаюцца ёй толькі ў БДУ, у лабараторыі возеразнаўства. У Беларусі няма іншых спецыялістаў, якія маглі б падзяліцца інфармацыяй з лабараторыяй, супрацоўнічаць з ёй. Адсутнасць спецыялістаў, вядома, замаруджвае тэмпы маніторынгу вышэйшай воднай раслiннасці. На сённяшні дзень даследаваныя толькі 50 азёраў і 23 ракі — пры тым, што ў нашай краіне каля 10.000 азёраў і больш за 20.000 рэк.

Аднак і тыя звесткі, што лабараторыя збірае з 1999 года, вельмі каштоўны матэрыял і падмурак для далейшага развіцця маніторынгу вышэйшай воднай раслiннасці. А для яго правядзення патрэбны многія гады. Толькі пасля шматгадовых назіранняў можна высветліць аб'ектыўную інфармацыю пра стан прыроднага асяроддзя і крыніцы яго забруджвання.

*Мікалай ГРАДЗЮШКА,*
*студэнт факультэта журналістыкі*

НАВУКА

# Карысць — у цесным альянсе

*Базавае бюджэтнае фінансаванне навукова-даследчай часткі БДУ складае прыкладна 28 працэнтаў ад усёй структуры фінансавання. Зразумела, што пры такой умове шляхі паступлення дадатковых грошай на навуковыя распрацоўкі прыходзіцца шукаць самастойна.*

*Вялікую частку фінансавых паступленняў прыносяць дзяржбюджэтныя дагаворы, недзе 58 працэнтаў, удзел у якіх навуковыя калектывы БДУ выйграюць у жорсткай конкурснай барацьбе, кожны раз даказваючы свае здольнасці. І толькі каля 14 працэнтаў грошай прыносяць гаспадарчыя дагаворы. Апошняя лічба, на думку начальніка навукова-даследчай часткі, намесніка прарэктара па навуковай рабоце БДУ Уладзіміра Васільевіча ПАНАРАДАВА, магла б быць і большай. Аднак для гэтага існуюць свае перашкоды.*

— Калі ў часы Савецкага Саюза навуковыя ўстановы не адчувалі недахопу ў гаспадарчых дагаворах, асабліва абароннай тэматыкі, то апошнім часам усё наадварот. Справа яшчэ і ў тым, што ў многіх прадпрыемстваў на навуковыя распрацоўкі часцяком адсутнічаюць сродкі. Першае, што яны зрабілі сёння, — пазбавіліся ад уласных навуковых лабараторый і пакінулі толькі тыя структуры, якія непасрэдна прыносяць прыбытак. Такім чынам, вытворцы эканомяць на навуцы. Але гэта не значыць, што яны не зацікаўлены ў новай прадукцыі. Калі адчуваецца ўжо зусім вострая неабходнасць у вынаходніцтвах, прадпрыемствы вымушаны звяртацца ў навуковыя ўстановы па дапамогу.

З вытворцамі найбольш цесныя кантакты маюць Беларускі нацыянальны тэхнічны універсітэт і Беларускі дзяржаўны універсітэт інфарматыкі і радыёэлектронікі, якія папаўняюць іх шэрагі новымі кадрамі. Наш універсітэт традыцыйна менш звязаны з вытворчасцю. Але і да нас па навуковыя распрацоўкі звяртаюцца розныя прадпрыемствы. Таму што БДУ сёння — гэта 20 факультэтаў, сярод якіх фізічны, радыёфізікі і электронікі, хімічны факультэт, факультэт прыкладной матэматыкі і інфарматыкі і механіка-матэматычны. (Тут варта успомніць і НДІ фізічных праблем, НДІ фізіка-хімічных праблем і інш.) У рамках дзярждагаворнай тэматыкі працуюць і нашыя гуманітарныя факультэты. Напрыклад, эканамісты цесна супрацоўнічаюць з банкамі, сацыёлагі праводзяць шматлікія сацыялагічныя апытанні рознага ўзроўню, географы даследуюць стан навакольнага асяроддзя і г.д.

Жадаючых зрабіць заказ нашаму універсітэту на навуковую распрацоўку не так ужо і мала. Аднак часта складваецца такая сітуацыя: навуковыя калектывы гадамі працуюць над пастаўленай перад імі задачай, а прадпрыемства не ў стане аплаціць закончаную работу.

*— Але БДУ можа пахваліцца і плацежаздольнымі заказчыкамі?*

— Нам вельмі прыемна працаваць з Салігорскім калійным камбінатам. Мы аналізуем для іх стан экалагічнай абстаноўкі ў раёне, даследуем засоленасць глебы, спрабуем вызначыць узровень сейсмалагічнай устойлівасці, вырашыць праблему з вялікімі масівамі горных парод на паверхні і г.д.

Прафесар Міхаіл Аляксандравіч Ксенафонтаў удала працуе з Міністэрствам па надзвычайных сітуацыях. Ён прапанаваў для вытворчасці вельмі эфектыўны сарбент — рэчыва, якое ўбірае ў сябе нафту і нафтапрадукты, разлітыя на паверхні зямлі ці вадаёма. Прафесар Уладзімір Аляксеевіч Савечнікаў распрацоўвае для Міністэрства па надзвычайных сітуацыях методыку апрацоўкі інфармацыі, атрыманай са спадарожніка, самалёта, верталёта, якая дазволіць прагназаваць магчымасць прыродных катаклізмаў кшталту наваднення і г.д.

Прафесар Дзмітрый Давыдавіч Грыништан вынайшаў цікавы прэпарат, пры дапамозе якога ваду з адкрытых вадаёмаў, азёр, нават балот можна даводзіць да пітнога стану і ўжываць падчас экстрэмальных сітуацый.

Хімікі актыўна супрацоўнічаюць з Міністэрствам аховы здароўя: распрацоўваюць новыя лекавыя прэпараты.

Стараемся працаваць з замежнымі заказчыкамі. Шмат праектаў з Расіяй, абмяркоўваем цэлы шэраг праектаў з Польшчай, у тым ліку навукова-вытворчыя, супрацоўнічаем з Украінай, спрабуем выходзіць са сваімі прапановамі на Прыбалтыку і г.д.

*— Некалькі дзесяцігоддзяў таму ў БДУ былі адкрыты навуковыя інстытуты. Планавалася, што яны з самага пачатку будуць цесна ўзаемадзейнічаць з факультэтамі універсітэта. Як ідуць справы сёння?*

— Яны і цяпер знаходзяцца ў цесным кантакце. Напрыклад, выкладчыкі фізічнага факультэта, кафедры ядзернай фізікі выконваюць сумесныя праекты з НДІ прыкладных фізічных праблем і НДІ ядзерных праблем. Хімічны факультэт і НДІ фізіка-хімічных праблем наогул знаходзяцца ў адным будынку. І часта цяжка разабраць, дзе факультэт, а дзе інстытут. І гэта цудоўна. Таму што, калі пачынаецца тэрытарыяльны падзел паміж гэтымі дзвюма структурамі, то з цягам часу нейкая граніца паміж імі пачынае адчувацца. А іх цесны альянс толькі ідзе на карысць навуцы і ўкараненню навуковых распрацовак. Можа, таму што хімікі працуюць у адной камандзе, менавіта ў іх у першую чаргу і пачалі развівацца навука і вытворчасць.

*— Прынята лічыць, што кожны павінен займацца нечым адным: навуковец — навукай, вытворца — вытворчасцю, і ёсць людзі, якія ажыццяўляюць сувязь паміж навукай і вытворчасцю...*

— Зразумела. Аднак сёння мы пастаўлены ў такія ўмовы, калі ў адным чалавеку павінны спалучацца ўсе гэтыя якасці. Аднак нават у калектыве навукоўцаў вельмі цяжка знайсці такога чалавека, які б узяў на сябе адказнасць лідэра, займаўся не толькі навукай, але і ўкараненнем навуковых распрацовак. У прыклад можна паставіць прафесара Яўгена Міхайлавіча Рахманько. Ён адначасова навукоўца, загадчык кафедры аналітычнай хіміі і генеральны дырэктар вучэбна-навукова-вытворчага прадпрыемства "Унітэхпрам". Прыкладам можа служыць і дацэнт Валерый Васільевіч Хадасевіч. Мала таго, што ён працуе на кафедры фізікі цвёрдага цела фізічнага факультэта, дык ён яшчэ і дырэктар навукова-вытворчага прадпрыемства "Актыў БДУ", якое выпускае вакуумнае абсталяванне.

Менавіта такія людзі нам сёння патрэбны як паветра.

*— Можна сказаць, што апошнім часам універсітэт скіроўвае ўвагу больш у бок прыкладных даследаванняў, адыходзячы ад сваёй фундаментальнасці?*

— Развіваць фундаментальную навуку вельмі важна. Дзякуючы ёй мы можам бачыць перспектывы. Аднак, развіваючы прыкладную навуку, мы вырашаем першачарговыя задачы. На мой погляд, сёння мы павінны імкнуцца прыблізіць вынікі фундаментальнай навукі да практыкі. І калі мы знойдзем такое кампраміснае рашэнне, нашы вынаходніцтвы будуць служыць на патрэбу чалавека ўжо сёння.

*Ганна АНАТОЛЬЕВА*

КУРСЫ

# Вучэбна-адукацыйная ўстанова БДУ «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы»

## ЗАПРАШАЕ НА КУРСЫ ПАВЫШЭННЯ КВАЛІФІКАЦЫІ ВЫКЛАДЧЫКАЎ І СУПРАЦОЎНІКАЎ БДУ

1. Статыстычны аналіз і апрацоўка даных на камп'ютары (для выкладчыкаў сацыялогіі, псіхалогіі, геаграфіі, біялогіі, медыцыны ВНУ) — *без адрыву ад працы,* з **13.01 па 11.04.2003**
2. Мадэляванне выхаваўчага працэсу ў ВНУ ва ўмовах структурнай трансфармацыі вучэбнага працэсу (для выхавальнікаў ВНУ) — *з частковым адрывам ад працы,* **з 13.01 па 07.03.**
3. Актуальныя праблемы выкладання беларускай філалогіі (выкладчыкі) — *з адрывам ад працы,* **з 13.01 па 25.01.**
4. Філасофская адукацыя ва ўмовах інтэграванай падрыхтоўкі спецыялістаў: ССНУ-ВНУ (выкладчыкі) — *з адрывам ад працы,* **з 13.01 па 25.01.**
5. Праектаванне і распрацоўка тэставых асяроддзяў па цыкле сацыяльна-гуманітарных дысцыплін у адукацыйных сістэмах (для распрацоўшчыкаў сістэм і кіраўнікоў БДУ) — *з частковым адрывам ад працы,* **з 13.01 па 15.03.**
6. Айчынная і сусветная гісторыя ў кантэксце цывілізацыйнага развіцця грамадства (для выкладчыкаў ВНУ на базе гістарычнага факультэта БДУ) — *без адрыву ад працы,* **з 13.01 па 22.03,** *заняткі 1 тыдзень у месяц.*
7. Нарматыўнае забеспячэнне дзвюхступеннай падрыхтоўкі спецыялістаў (для начальнікаў вучэбна-метадычных аддзелаў, метадыстаў ВНУ) — *з адрывам ад працы,* **з 20.01 па 31.01.**
8. Камп'ютарная графіка і Web-мастэрынг (для выкладчыкаў інфарматыкі ВНУ, сістэмы павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў) — *з адрывам ад працы,* **з 27.01 па 08.02.**
9. Праблемы біямедыцынскай этыкі ў сучаснай тэорыі і практыцы (выкладчыкі) — *з адрывам ад працы,* **з 27.01 па 08.02.**
10. Менеджмент сучаснай вышэйшай школы (для прарэктараў па АГР і агульных пытаннях) — *з адрывам ад працы,* **з 03.02 па 14.02.**
11. Прыродазнаўчанавуковыя дысцыпліны (для выкладчыкаў фізікі ВНУ) — *з частковым адрывам ад працы,* **з 03.02 па 05.04.**
12. Айчынная і сусветная гісторыя: новае ў змесце і выкладанні (выкладчыкі) — *з адрывам ад працы,* **з 03.02 па 15.02.**
13. Выкладанне сацыяльна-гуманітарных дысцыплін ва ўмовах дзвюхступеннай сістэмы падрыхтоўкі спецыялістаў: пошук інтэграцыйнай мадэлі (загадчыкі кафедраў) — *з частковым адрывам ад працы,* **з 03.02 па 15.03.**
14. Праектаванне і распрацоўка навучальна-метадычных комплексаў па цыкле сацыяльна-гуманітарных дысцыплін у сістэме дзвюхступеннай універсітэцкай адукацыі (для выкладчыкаў БДУ) — *з частковым адрывам ад працы,* **з 03.02 па 29.03.**
15. Дзвюхступенная псіхолага-педагагічная падрыхтоўка спецыялістаў: навукова-тэарэтычныя і метадычныя аспекты (выкладчыкі ВНУ) — *з адрывам ад працы,* **з 10.02 па 22.02.**
16. Сацыяльныя камунікацыі ў грамадстве, сістэме адукацыі і вучэбным працэсе (для выкладчыкаў ВНУ, ССНУ) — *без адрыву ад працы,* **з 10.02 па 22.02.**
17. Менеджмент сучаснай вышэйшай школы (для загадчыкаў аддзелаў магістратуры, аспірантуры і дактарантуры) — *з адрывам ад працы,* **з 17.02 па 28.02.**
18. Навучальны курс "Сучасная беларуская культура: асноўныя тыпы, формы і тэндэнцыі" ва ўмовах магістэрскай падрыхтоўкі — *з адрывам ад працы,* **з 17.02 па 01.03.**
19. Канцэпцыя сучаснага прыродазнаўства (для выкладчыкаў гуманітарных дысцыплін ВНУ) — *з частковым адрывам ад працы,* **з 24.02 па 26.04.**
20. Школа маладзёжнага актыву БДУ: змест і накірункі развіцця (для маладзёжнага актыву БДУ) — *з частковым адрывам ад працы,* **з 24.02 па 18.04.**

ПЕРАПАДРЫХТОЎКА

21. "Эканамічная палітыка" з кваліфікацыяй "Выкладчык эканамічных дысцыплін" — *без адрыву ад працы,* **з 13.01.03 па 07.06.04.**
22. "Менеджмент у сферы адукацыі" з спецыялізацыяй "Кіраўніцтва вышэйшай школай" — *без адрыву ад працы,* **з 27.01.03 па 27.01.05.**

*Калі вас зацікавіла наша інфармацыя і вы гатовы прыняць удзел у курсах, тэлефануйце па нумары 222-83-03* ***для папярэдняга запісу ў групы.***

*Наш адрас: г.Мінск, вул. Маскоўская, 15, Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы БДУ, каб. 319, тел / факс 222-83-03*

ТРАДЫЦЫІ

# Шчодрык-Шчадрэц-Шчодра-Гагатуха-Конікі

— разнастайныя рэгіянальныя назвы сустрэчы Новага года па юліянскім календары (з 13 на 14 студзеня). Адзначаюць яго ўжо на другім тыдні калядаванняў — песенных тэатралізаваных абыходаў гаспадарскіх двароў са святочнымі калядкамі. Гэта былі віншавальныя велічальна-гімнавыя песні, пабудаваныя на славеснай магіі — веры, што жадаемы гаспадару гіпербалізаваны поспех у сям'і і гаспадарцы збудзецца, бо пасля кожнага радка ішлі магічныя прыпевы "Шчодры вечар, святы вечар!", роля якіх аналагічна хрысціянскаму "Амінь!"

Шчодрыку на першым калядным тыдні папярэднічалі Посная куцця (6 студзеня), Каляды (7 студзеня), Зорка, Каза, Ваджэнне мядзведзя. З 7 па 18 студзеня (гэты дзень называлі яшчэ Вадзянымі Калядамі) на паўночным захадзе Беларусі моладзь ва ўсе вечары да ранішняй зоркі ладзіла вясельныя камедыі — "Жаніцьбу Цярэшкі".

Шчодра была кульмінацыяй 2-тыднёвых тэатралізавана-карнавальных зімовых святак. У наш час яе можна пабачыць ва ўсёй самабытнасці, мастацкай шматфарбнасці і бытавой прыроднай натуральнасці ў адным з самых старажытных цэнтраў Тураўскай зямлі — Давыд-Гарадку. Да дваццаці тэатралізаваных гуртоў шчадроўнікаў абыходзяць тут у наш час гаспадаркі, спяваючы шчадроўкі. Вось самая папулярная з іх:

Добры вечар табе, пане-гаспадару,
радуйся!
Ой, радуйся, земля, год новы нарадзіўся!
Засцілайце столы новы абрусамі.
Кладзіце пірогі з ярае пшаніцы,
Бо прыйшлі да цябе тры святочкі
ў госці.
А першае свята — святыя Каляды.
А другое свята — святая Шчодра.
А трэцяе свята — свята Вадохрышча.
Хай святкуе з вамі ўся ваша радзіна,
радуйся,
Ой, радуйся, земля, год новы нарадзіўся!

*Прыпеў "Радуйся, ой, радуйся, земля, год Новы нарадзіўся!" спяваецца пасля кожнага радка.*

Тэатралізаваныя шчадроўныя прадстаўленні ладзіліся вакол маскі Казы — сімвала ўрадлівасці нівы, а на тураўскіх землях — вакол вершніка, у якім ёсць водгукі і дагістарычнага прыручэння дзікіх жывёл, і гістарычнай эпохі вялікага перасялення плямёнаў. Лейтматывам першых былі карагоды з Казой ("Дзе каза рогам — там жыта стогам"). А вось найбольш папулярная шчадроўка з Канём:

Ой, там, пад шчадром Васілька з кацём,
Ой, грай, мора, радуйся, зямля!
На кані сядзіць, дудачку дзяржыць.
У дудачку йграе, слічна спявае.
Прыйшла да Васіля маманька яго:
— Ой, сынку, сынку, хто цябе вучыў,
Хто цябе вучыў у дудачку йграці?
У дудачку йграці, слічна спяваці?
— Была ў караля адная дачка.
Йна навучыла ў дудачку йграці.
У дудачку йграці, слічна спяваці,
Ой, грай, мора, радуйся зямля!

*"Ой, грай, мора, радуйся, зямля!" спяваецца пасля кожнага радка.*

Рабілі Каня так. На калок вешалі два рэшаты, паміж якімі сядзелі хлопцы. Потым спераду прычаплялі конскую галаву, а ззаду — хвост з валосся ці лёну. Хлопцы пакрываліся зверху посцілкай.

У другім, больш распаўсюджаным варыянце, на поясе вершніка рабілі абруч, пакрывалі яго посцілкай, якая закрывала ногі вершніка. Усё астатняе рабілі аналагічна. У Давыд-Гарадку Коннікаў было два: дарослы (вельмі часта ў выглядзе цыгана) і хлопчык. Дарэчы, на ўсходняй Гомельшчыне Шчодра вядома як выключна жаночы абрад, а на Заходнім Палессі — як дзявочы. Гагатухай з-за характэрнага прыпеву "Го-го-го!" называлі свята беларусы Беласточчыны.

КАРАГОД-ГУЛЬНЯ "КОНІК"

*Запісана Міколам Котавым у 1984 годзе ад фальклорнага гурта "Конікі" ў Давыд-Гарадку Столінскага раёна.*

Галаву каня рабілі на кійку як вясёлую, прыгожую маску, на якой ён нібы іржаў. Хлопец-конь трымаў кіёк паміж ног. Посцілка пакрывала хлопца з нагамі, ззаду прычэплівалі доўгі конскі хвост, і стваралася поўнае ўражанне, што перад намі вершнік. Часта іх было два — дарослы і маленькі.

Коннік ішоў па вуліцы і весела, з гігіканнем запрашаў шчадраваць. Потым ён узначальваў гурт шчадроўнікаў у абыходзе дамоў: весяліў у карагодным коле, бег галопам па вуліцы, выбрыкваў перад хатамі, трэс грываю, круціў хвастом, прысядаў на заднія ногі, высока задраўшы галаву, падаў зняможаны. Гурт шчадроўнікаў вёў дыялогі з гаспадарамі — прасіў яму "мерку аўса", грошы на авёс, піці-есці даці.



*Фота IREX/PROMEDIA*

Вакол конніка водзяць шчадроўныя карагоды: то сыходзяцца да цэнтра кола, прысядаюць ля конніка, а ён, весела заіржаўшы, узвышаецца над імі, то коннік у цэнтры кола скача свой танец, а карагоднікі плясканнем ствараюць яму рытм, прыспеўваюць, самі ўслед за ім скачуць, разыходзяцца і зыходзяцца ў карагодзе. Адна з карагодніц падыходзіць да стомленага каня, прыгаворваючы ласкава гладзіць яго па грыўцы, бярэ за аброць і ставіць першым у карагодзе. Стаўшы адзін за адным, удзельнікі паўтараюць хвалевыя рухі ("вілюжкі" па-мясцоваму), і ўсе разам ідуць да гаспадара, кланяюцца яму з надзеяй на добрую ахвяру: хлеб, сала, каўбасу, грошы, чарку. Удзячна спяваюць хатнім велічальныя песні-ідэалізацыі, адорваюць весялосцю, смехам, жартамі, скокамі, танцамі, музыкай.

Самай прыгожай часткай карагодаў з'яўляюцца песні з вобразам каня, якіх бясконца многа сярод шчадровак і нават сярод казацкіх, накшталт наступнай:

Ой, косю, мой косю,
Косю вараненькі,
Прадам цябе, косю,
За талер драбненькі.
Не будзеш там есці
Шаўковай травіцы,
Не будзеш там піці
Крынічнай вадзіцы.
Цябе будуць біці,
Косю, батагамі,
А я буду плакаць
Горкімі слязамі.
А хто ж табе, косю,
Там грыўку расчэша,
А хто ж табе, косю,
Сардэнька пацеша.
Ой, косю, мой косю,
Косю вараненькі.
Няхай прападае
Талер бяленькі.
На талер драбненькі
Я не разжывуся,
З табою, мой косю,
Я не разлучуся.

*Васіль ЛІЦЬВІНКА*

ЗОРКІ ГАВОРАЦЬ

# У год Казы



АВЕН

У 2003 г. варта набываць веды і новыя навыкі. Для многіх гэты год стане паваротным, істотна зменіцца навакольнае атачэнне. Ад пачатку года і да жніўня Бараноў чакае ўдача ў каханні.

ЦЯЛЕЦ

У 2003 г. варта ўважліва ставіцца да фінансавых пытанняў. У першыя 7 месяцаў года будзе актуальнай тэма змены месца жыхарства ці нават грамадзянства. Зоркі вястуюць удачу пры ўкладанні капітала ў нерухомасць.

БЛІЗНЯТЫ

Пажадана не прыдумляць доўгатэрміновых планаў: яны могуць разбурыцца. Першая палова года пройдзе пад знакам удачы ў камандзіроўках і паездках. Але варта таксама не забывацца на сям'ю і бацькоў.

РАК

Першая палова года — добры час для практычных і фінансавых пытанняў. Ад пачатку мая трэба больш увагі надаць працы ў калектыве, стварэнню доўгатэрміновых планаў.

ЛЕЎ

Да мая Льву варта сядзець ціхенька і не прыцягваць увагі да сваёй персоны. Лепш культываваць у сабе пачуццё ўнутранай свабоды і незалежнасці ад матэрыяльных абставінаў і жыццёвых сітуацый. Ад пачатку мая і да канца года спатрэбяцца запасы аптымізму.

ПАННА

Асноўная задача першай паловы года — умацаванне сям'і. Ад пачатку мая можна заняцца навучаннем, удалымі будуць далёкія паездкі — напрыклад, за мяжу.

ШАЛІ

У першыя 5 месяцаў варта сканцэнтравацца на атрыманні ведаў, якія дапамогуць як у прафесійнай, так і ў асабістай сферы. Пачатак года можа прынесці расчараванні ў сяброўстве.

СКАРПІЁН

Першая палова года багатая на канфлікты і перспектывы кар'ернага росту. З красавіка спатрэбіцца максімум увагі да грамадскай дзейнасці. У другой палове года трэба імкнуцца да камфорту і лагоднасці — як у шлюбе, так і ў сацыяльнай сферы.

СТРАЛЕЦ

Ад пачатку мая давядзецца вырашаць побытавыя праблемы — дробязі, ад якіх, уласна, і залежыць жыццё. Сюды ж далучацца і медыцынскія праблемы.

КАЗЯРОГ

Першыя 5 месяцаў варта прысвяціць сабе і свайму здароўю, пастарацца ўберагчыся ад нервовых стрэсаў. У другой палове года з'явіцца неабходнасць змяніць свой імідж — ад прычоскі да рэпутацыі.

ВАДАЛЕЙ

Першую палову года Вадалеяў будзе займаць адна задача — навучыцца кахаць і быць каханымі. Радуйцеся жыццю і развівайце свае таленты. Вучыцеся ператвараць працу ў гульню.

РЫБЫ

Да мая варта як мага больш увагі надаваць сямейным справам. Рыбам на працягу года варта асцерагацца паездак, асабліва далёкіх.

КАЛЯДЫ

# Дзе каза бывае, там шчасце вітае

Добры вечар,
Шчодры вечар
Усім людзям
На здароўе!

У Беларусі зімовыя калядныя святы адзначаюцца ў каталікоў з 25 снежня, а ў праваслаўных вернікаў з 7 студзеня.

Пачаткам святкавання Нараджэння Хрыстовага была Святая вячэра, або Посная куцця. Усяго на Каляды бывае тры куцці. Другая з іх — Шчодрая — адзначаецца 13 студзеня, трэцяя — Вадзяная, або Галодная — 18 студзеня, на Вадохрышча, падчас заканчэння Калядаў.

Нашы продкі ўспрымалі Каляду, верагодна, як маці Сонца. У каляднай абрадавай паэзіі яна надзялялася рысамі вярхоўных духаў і багоў, ёй служыць увесь касмічны свет.

Прыехала Каляда
на белым кані.
Яе конічак — ясен месячык,
Яе дужачка — ясна зорачка,
Яе пужачка — ясна звёздачка,
Яе вазок з тоўстага лядку,
Яе кажушок з белага сняжку.

Моладзь збіралася разам перадкалядным адвячоркам. Дзяўчаты і хлопцы апраналіся ў калядныя касцюмы, рабілі зорку, "казу" і абыходзілі хаты, спяваючы калядныя песні і віншуючы гаспадароў. Галоўнай сярод калядоўшчыкаў была вясёлая "Каза", якая танцавала ў кожным двары, весела скакала на вуліцы, пакуль карагод калядоўшчыкаў спяваў:

Дзе каза ходзіць,
Там жыта родзіць.
Дзе каза рогам,
Там жыта стогам.
Дзе каза хвастом,
Там жыта кустом.
Дзе каза бывае,
Там шчасце вітае.

Лічылася, што з дапамогай гэтай жывёлы можна выгнаць з двара нячысцікаў, а на наступны год — мець прыплод жывёлы і добры ўраджай. У калядныя вечары моладзь (асабліва дзяўчаты) збіралася, каб паваражыць, ладзіла гульні. Асноўная з іх — "Жаніцьба Цярэшкі", якая цягнулася цэлую ноч. Гэтая гульня — нібы падрыхтоўка моладзі да сапраўднага шлюбу.

Шчасця і долі супрацоўнікам і студэнцтву БДУ!

З Калядамі! З Новым годам!

*Мікола КОТАЎ,*
*навуковы супрацоўнік НДЛ беларускага фальклору БДУ*



БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года
Заснавальнік газеты – БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ
Газета ўзнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР

*19 снежня 2002 года*
*Падпісана да друку 18.12.2002*
*Ум. друк. арк. 1*
*Зак. 1452. Тыраж 1000 экз.*

*Газета зарэгістравана Дзяржаўным камітэтам Рэспублікі Беларусь па друку. Рэгістрацыйнае пасведчанне № 149 ад 28 чэрвеня 1996 года.*

*Распрацоўшчык лагатыпа і дызайну газеты У.У. Васюк*

*Газета надрукавана ў РУП "Выдавецкі цэнтр БДУ" 220030, г. Мінск, вул. Чырвонаармейская, 6*

**Рэдактар Т.М. КАЗАК**

*Адрас рэдакцыі: 220050, Мінск, Універсітэцкі гарадок, вул. Бабруйская, 7, паверх 4, пакой 411, тэлефон 209-53-45, e-mail: Gazeta@bsu.by*